УДК 141.5Гегель

# СТАНАЎЛЕННЕ ДЫЯЛЕКТЫЧНАЙ МЕТАДАЛОГІІ ГЕГЕЛЯ: АСНОЎНЫЯ ФАКТАРЫ І ХАРАКТЭРНЫЯ РЫСЫ

***А. І. Бабко,***
*кандыдат філасофскіх навук, дацэнт, дацэнт кафедры эканомікі і перакладчыцкай справы прыватнай установы адукацыі «Інстытут прадпрымальніцкай дзейнасці»*

**Анатацыя.** Вывучэнне напоўненага драматычнымі калізіямі працэсу фарміравання дыялектычнай метадалогіі Гегеля можа і павінна паспрыяць эфектыўнаму яе ўжыванню ў духоўным жыцці чалавека і чалавецтва. Станаўленне гегелеўскай дыялектыкі адзначана магутным уплывам Вялікай французскай рэвалюцыі, супярэчлівы характар якой яна перадае тэарэтычнымі сродкамі. Першапачатковыя парасткі дыялектычнага мыслення ў Гегеля выяўляюцца ў вострай крытыцы аднабаковых формаў духоўнага жыцця, у якіх скажаецца яго паўната і багацце. Згаданая крытыка вядзецца ім спачатку на грунце антынамічнага стылю мыслення, які пераадольваецца ў працэсе яго даследаванняў на аснове ідэі дынамічнага адзінства супрацьлеглых пачаткаў. Найбольш дзейсную форму рэалізацыі дадзенай ідэі Гегель здолеў разгледзець у канчатковым выніку ў тэарэтычным паняцці і філасофскім мысленні.

**Ключавыя словы:** адзінства супрацьлеглых пачаткаў, антынамічны стыль мыслення, дыялектыка, дыялектычная метадалогія, прынцып несупярэчнасці, рэлігія, сінтэз, супярэчнасць, філасофія, эстэтычны ідэал.

# FORMATION OF HEGEL'S DIALECTIC METHODOLOGY: MAIN FACTORS AND CHARACTERISTICS

***A. Babko,***
*PhD in Philosophy, Associate Professor, Associate Professor of the Department of Economics and Translation of the Private Educational Institution «Institute of Entrepreneurship»*

**Abstract.** The study of the process of formation of Hegel's dialectical methodology, filled with dramatic collisions, can and should contribute to its effective application in the spiritual life of man and humanity. The formation of Hegelian dialectics was marked by the powerful influence of the Great French Revolution, the contradictory nature of which it conveys through theoretical means. The initial germs of dialectical thinking in Hegel are revealed in the sharp criticism of one-sided forms of spiritual life, in which its fullness and richness are distorted. The mentioned criticism is carried out by him primarily on the basis of an antinomian style of thinking, which is overcome in the course of his research on the basis of the idea of the dynamic unity of opposite principles. Hegel managed to consider the most effective form of implementation of this idea in the final result in theoretical concepts and philosophical thinking.
**Keywords:** unity of opposite principles, antinomic style of thinking, dialectics, dialectical methodology, principle of non-contradiction, religion, synthesis, contradiction, philosophy, aesthetic ideal.

Філасофія Гегеля належыць да самых уплывовых феноменаў у гісторыі духоўных пошукаў чалавецтва. У сучасных умовах яна ўспрымаецца найчасцей крытычна, аднак сам факт крытычнага стаўлення да яе красамоўна сведчыць пра яе актуальнасць і значнасць: яна правакуе, кранае, вымагае аналізу і рэакцыі. Разам з тым пэўная частка даследчыкаў справядліва мяркуюць, што распрацаваная вялікім нямецкім філосафам дыялектычная метадалогія была і застаецца эфектыўным сродкам тэарэтычнага мыслення і практычнай дзейнасці. Яе фарміраванне ўяўляе сабой складаны, супярэчлівы, напоўнены ўнутраным драматызмам працэс, вывучэнне якога можа і павінна паспрыяць паглыбленню яе разумення і плённаму ўжыванню ў розных галінах тэарэтычных даследаванняў і ў духоўным жыцці ўвогуле.

Раннія пошукі Гегеля адбываліся пад вырашальным уплывам Вялікай французскай рэвалюцыі, якую ён спачатку вітаў з захапленнем і энтузіязмам. Пра гэта сведчаць і пэўныя факты яго біяграфіі (згаданы ўплыў быў настолькі моцным, што рэвалюцыйныя падзеі зрабіліся падметам шматгадовых даследаванняў філосафа [5, с. 421]), і характар яго першых твораў, у якіх гучаць палкі пратэст супраць дэспатызму і рэзкая крытыка звязаных з ім ідэалагічных форм. Малады тэарэтык уважліва сачыў за разгортваннем рэвалюцыйных падзей і мусіў канфрантаваць з іх супярэчлівай, «парадаксальнай» логікай. Варта адзначыць, што ва ўспрыманні ім згаданага гістарычнага феномена выяўляецца (не заўсёды выразнае і паслядоўнае) не-

прыняцце абстрактнай аднабаковасці, характэрнае для яго сфарміраванай, выбудаванай на дыялектычных прынцыпах філасофіі. Яскравым прыкладам такога непрыняцця з'яўляецца рэзка негатыўная пазіцыя ў дачыненні да якабінскага тэрору (выказаная ім у перапісцы з Шэлінгам [2, с. 214]).

У тэарэтычным плане першапачатковы этап фарміравання гегелеўскай філасофіі адзначаны грунтоўным уплывам Канта. Антынамічны стыль кантаўскага мыслення знаходзіць водгук у характэрным для маладога Гегеля рэзкім супрацьпастаўленні з'яў грамадскай рэчаіснасці, аспектаў і стратэгій духоўнага жыцця (аб'ектыўная versus суб'ектыўная і пазітыўная versus натуральная рэлігія, абстрактная разумовая дзейнасць і памяць versus пачуццё і сэрца, Ісус versus Сакрат, фарысеі versus Ісус, хрысціянства versus Антычнасць, пазітыўнасць versus свабода і г. д.). У кантэксце аналізу кантаўскага ўплыву на станаўленне гегелеўскай дыялектычнай метадалогіі неабходна адзначыць той факт, што першапачаткова ён не прывёў маладога тэарэтыка да сур'ёзнага даследавання метафізічных праблем. Тут таксама выяўляецца ў пэўнай ступені непрыняцце ім аднабаковасці, у якой бы форме яна ні здзяйснялася: метафізічныя і лагічныя праблемы бачацца Гегелю яшчэ занадта адцягненымі, ён не распазнаў пакуль што здольнасці філасофскага мыслення выйсці на ўзровень канкрэтнай усеагульнасці пры іх вырашэнні. Таму разам з пэўнай слабасцю філасофскага патэнцыялу ранняй гегелеўскай думкі згаданы факт засведчыў і тэндэнцыю, якая вядзе да будучай яе велічы.

Непрыхільнасць маладога Гегеля да аднабаковых формаў духоўнага жыцця (у якіх скажаецца і разбураецца шматаблічная, багатая, канкрэтная рэчаіснасць) адбілася таксама на яго інтэрпрэтацыі Антычнасці. Ён бачыць асноўную характарыстыку дадзенай эпохі ў сфарміраванай у яе ўмовах здольнасці індывіда ўзняцца да свядомага і актыўнага адстойвання інтарэсаў усяго грамадства, жыць дзеля грамадска значных мэт, самаахвярна змагацца за свабоду Радзімы [3, с. 186]. Аднак пры гэтым Гегель непрыкметна для сябе трапляе ў пастку «абстрактнага», аднабаковага падыходу, таму што адзінства індывідуальнага і калектыўнага, якое супрацьпастаўляецца індывідуалізму як узорнае, як вяршыня духоўнасці, мае ў дадзеным выпадку пазбаўлены ўнутранага адрознення і апасродкавання, а таму і аднабаковы, характар, што зробіцца прадметам вострай і абгрунтаванай крытыкі ў яго будучай філасофскай сістэме.

Неабходна адзначыць разам з тым, што філосаф захавае глыбокую прыхільнасць да антычнага тыпу цэласнай, гарманічнай, ге-

раічнай асобы на ўсё жыццё (у сваіх лекцыях па філасофіі мастацтва ён даводзіў, што патрэба татальнасці, паўнаты, жывой самастойнасці заўсёды будзе прысутнічаць у нас [6, с. 194]). Гарманічная існасць антычнага чалавека выяўляецца, на думку маладога Гегеля, і ў творчым пераўтварэнні ім свайго прыроднага пачатку на грунце прынцыпу прыгажосці [1, с. 70]. Гэты момант будзе развіты ў эстэтычных даследаваннях філосафа, у выніку якіх гарманічнае ўвасабленне духоўнага ў пачуццёвым матэрыяле будзе разглядацца як падставовая структра эстэтычнага ідэалу.

У сувязі з гэтым цалкам слушнай падаецца здагадка, згодна з якой грунтоўны эстэтычны патэнцыял прынцыпу адзінства супрацьлеглых пачаткаў, яго істотная сувязь з ідэалам гарманічна развітай асобы належалі да найглыбейшых, непазбыўных фактараў, якія абумовілі засяроджанасць гегелеўскага мыслення на распрацоўцы дыялектычнай метадалогіі. У больш агульным плане можна меркаваць, што дзякуючы гэтаму аспекту дыялектыка была, ёсць і заўсёды будзе запатрабаванай у духоўных пошуках чалавека і чалавецтва.

Разам з тым, аднак, нястомная гегелеўская думка стымулявалася вострымі калізіямі грамадскага і індывідуальнага парадку. Драматычныя супярэчнасці паміж яго юнацкімі ідэаламі і празаічнай рэальнасцю, якую ў рэшце рэшт спарадзіла рэвалюцыя, надзвычай востра перажываліся ім [4, с. 131–144]. Вынікам інтэнсіўнай інтэлектуальнай працы, якая разгортвалася на гэтым грунце, быў зварот маладога тэарэтыка да прынцыпу адзінства супрацьлеглых пачаткаў. Кантаўскі стыль мыслення ўсведамляецца ім ужо як недастатковы ў кантэксце вырашэння тэарэтычных і практычных праблем, што хвалявалі ягоных сучаснікаў і яго самога. Далейшы шлях яго духоўнага самаразвіцця можна ахарактарызаваць як няўхільнае набліжэнне да паслядоўнага варыянту дыялектыкі, дзе кантаўская антынамічнасць робіцца неад’емным момантам, дзе антыномія, супярэчнасць мае жывы, дынамічны характар і вырашаецца, «здымаецца» праз рухомы сінтэз супрацьлеглых пачаткаў.

Крыніцай найвялікшай цяжкасці ў кантэксце распрацоўкі гегелеўскай дыялектычнай метадалогіі была шматвекавая традыцыя, згодна з якой тэарэтычнае мысленне павінна грунтавацца на прынцыпе несупярэчнасці. Адносна працяглы час Гегель таксама не мог зразумець, як філасофская рэфлексія можа справіцца з «жывым» і рухомым сінтэзам супрацьлеглага, і шукаў альтэрнатыўныя спосабы вырашэння гэтай задачы (мяркуючы, як і раней, што найлепшым чынам гэта можна зрабіць у сферы рэлігіі).

У сувязі з гэтым слушнай падаецца думка, згодна з якой найгрунтоўнейшым фактарам, які паспрыяў пераасэнсаванню філосафам характару і патэнцыялу тэарэтычнага паняцця, было ўсведамленне ім імпліцытнай прысутнасці мыслення ва ўсіх праявах чалавечай існасці (характэрнае і для пачатковага перыяду яго духоўнага самаразвіцця [1, с. 48–49]). Калі розум іманентны розным сферам духоўнай рэчаіснасці і здзяйсняецца ў іх, то ён павінен быць здольным перадаць іх рух, іх развіццё ў эксплiцытнай форме. Раскрыць і задзейнічаць дадзеную здольнасць павінна філасофія, якую ў канчатковым выніку Гегель робіць цэнтрам сваёй тытанічнай духоўнай працы.

Такім чынам, станаўленне гегелеўскай дыялектыкі адбывалася пад знакам драматычных грамадскіх працэсаў, выкліканых Вялікай французскай рэвалюцыяй, якія будучы вялікі філосаф востра перажываў і нястомна асэнсоўваў. У выніку ён прайшоў складаны шлях ад максімалісцкага юначага непрыняцця аднабаковых формаў духоўнага жыцця, якое грунтавалася на антынамічным стылі мыслення кантаўскага тыпу, да дыялектычнай метадалогіі, якая нацэльвала на пераадоленне супярэчнасці праз рухомы, жывы сінтэз, што адбываецца ва ўлонні тэарэтычнага паняцця.


1. *Гегель, Г. В. Ф.* Народная религия и христианство / Г. В. Ф. Гегель // Работы разных лет : в 2 т. / Г. В. Ф. Гегель. – М. : Мысль, 1972. – Т. 1. – С. 45–86.

2. *Гегель, Г. В. Ф.* Письма / Г. В. Ф. Гегель // Работы разных лет : в 2 т. / Г. В. Ф. Гегель. – М. : Мысль, 1972. – Т. 2. – С. 213–530.

3. *Гегель, Г. В. Ф.* Позитивность христианской религии / Г. В. Ф. Гегель // Работы разных лет : в 2 т. / Г. В. Ф. Гегель. – М. : Мысль, 1972. – Т. 1. – С. 87–207.

4. *Лукач, Д.* Молодой Гегель и проблемы капиталистического общества / Д. Лукач. – М. : Наука, 1987. – 616 с.

5. *Biedermann, G.* Die Französische Revolution in der Sicht der deutschen Klassik / G. Biedermann, E. Lange // Deutsche Zeitschrift für Philosophie. – 1987. – № 5. – S. 414–423.

6. *Hegel, G. W. F.* Ästhetik : in 2 Bd. / G. W. F. Hegel. – 3. Aufl. – Berlin ; Weimar : Aufbau-Verlag, 1976. – Bd. 1. – 591 S.